*УДК 882.6-09*

*Л. Г. БАРАНОЎСКАЯ*

# ВЫЗНАЧЭННЕ ТЭРМІНА «МАСТАЦКАЯ АНІМАЛІСТЫКА»

*Магілёўскі дзяржаўны універсітэт імя А. А. Куляшова*

*(Паступіў у рэдакцыю 13.07.2004)*

У сучасным айчынным літаратуразнаўстве ўсё часцей ужываюцца тэрміны «анімалізм», «анімалістыка» (ад лац. animal — жывёла). Пры іх выкарыстанні маюцца на ўвазе абазначэнне натуралістычнай апісальнасці, алегарычнае суаднясенне чалавека і жывёлы. Гаворачы пра мастацкае ўвасабленне анімалістычных вобразаў, даследчыкі адзначаюць «прывязанасць» да фальклору, літаратурна-кніжных традыцый, творчае засваенне вопыту сусветнай культуры.

У літаратуры прырода выконвае надзвычай важную эстэтычную функцыю. Спазнаць яе вобразы можна праз светабачанне чалавека, які глыбей узіраецца ў прыродныя таямніцы, каб найперш зразумець самога сябе. З старажытных часоў чалавечае жыццё цесна спалучана з прыродай, навакольным светам, таму жывёлы займаюць значнае месца ў практычнай дзейнасці людзей. Невыпадкова гісторыя развіцця культуры пачалася з розных форм заацэнтрызму — абагаўлення і шанавання жывёл*.

Антрапацэнтрызм, які прыйшоў на змену заацэнтрызму, прывёў да самагрунтавання чалавека, вылучыў яго са свету прыроды і ўзвысіў над гэтым светам; змяніліся адносіны паміж чалавекам і жывёламі. «Калі заацэнтрызм ёсць стадыя, якая гістарычна перажыла сябе, прайшла стадыю культураўтварэння, то анімалізму належыць узрастаючая роля ў складанні ўмоў да будучай, экалагічна збалансаванай культуры, якая пераадолела «згубную» аднабаковасць антрапацэнтрызму», — адзначае М. Эпштэйн [12, с. 89].

З цягам часу, як бы не мяняліся ўзаемаадносіны грамадства і прыроды, заўсёды адчувалася ўзаемасувязь чалавека са светам фауны. Цяжка пераацаніць ролю жывёл у раскрыцці самасвядомасці чалавека. Яны сведчаць пра асацыятыўнае ўспрыманне, калі анімалістычныя вобразы з'яўляліся фіксатарамі пры адлюстраванні розных з'яў рэчаіснасці. З прадстаўнікамі фауны людзі суадносілі краіны свету, стыхіі, поры года і г. д. Прычым кожны народ або краіна мае сваю сістэму анімалістычных вобразаў. Так, полымя ў народаў Кітая і Японіі асацыіруецца з Феніксам, у Старажытнай Грэцыі — з драконам. Аналіз такіх сістэм дапамагае асэнсаваць асаблівасці, каларыт, сутнасць светапогляду гэтых народаў, пэўных рэлігій.

Анімалістычныя вобразы шырока прадстаўлены ў фальлорных творах усходніх славян: у легендах, валачобных, купальскіх, вясельных песнях, казках, баладах, замовах, пахавальных галашэннях і г. д. Напрыклад, на Беларусі пашыраны легенды пра князя-ваўкалака Усяслава Чарадзея, аднаго з герояў «Слова аб палку Ігаравым». У творы аўтар малюе князя як чараўніка, які мог ператварацца ў ваўка, сокала, нечакана знікаць і зноў з'яўляцца ў самых розных мясцінах Русі. Цэлы калейдаскоп вобразаў фауны прадстаўлены ў лепшых помніках старажытнай літаратуры, дзе анімалістычныя матывы звязаны з пейзажам, побытам людзей (напрыклад, «Песня пра зубра» М. Гусоўскага).

Дарэчы, жывёльны эпас бярэ пачатак з казак пра жывёл, у якіх пры дапамозе анімалістычных вобразаў паказаны і прааналізаваны людскія ўчынкі, паводзіны, характары. Створаныя анімалістычныя сюжэты з'яўляюцца алегарычным увасабленнем чалавечых нораваў і ўзаемаадносін. У казачным эпасе склалася асноўная тыпалогія анімалістычных вобразаў (воўк — дурны ў казках «Святы воўк», «П'яны воўк»; ліса — хітрая ў казках «Пра мужыка і лісу», «Ліса-каталічка» і г. д.), якая атрымала далейшае развіццё ў мастацкай літаратуры, у першую чаргу, у байках (напрыклад, «Ястраб, лісіца і певень» (1913), «Груган і салавей» (1914) Я. Купалы, «Варона і чыж» (1915) М. Багдановіча і інш.).

---

* Гаворка ідзе пра татэмізм. Тэрмін «татэм» утвораны ад слоў «от-отем» або «от-отам», што азначае «яго род», паўночнаамерыканскіх індзейцаў. Татэм — не бажаство, галоўнае ў татэмізме — вера ў радство з ім.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

У беларускай літаратуры мастацкая анімалістыка выявіла сябе найперш у лірыцы (вершы «Мая душа», «Страцім-лебедзь» М. Багдановіча, «Воўк», «І вецер, і сокал, і я...» Я. Купала, «Развітальная песня», «Жаўранак — звонкая ніць...», «Крумкачы», «О, мой цудоўны край», «Белавежскі алень» У. Караткевіча, «Бяскрылыя гусі», «Ах, мілы конь, ах, мілы косю...», «Коні на праспекце», «Маналог мядзведзя», «Ваўчыца ў звярынцы», «Скарга прыручанага ваўка» Я. Сіпакова і інш.) і ў малых празаічных формах (апавяданні «Павук», «Вяселле», «Сініца» Ядвігіна Ш., «Міхаська» Цёткі, «Як птушкі дуб ратавалі», «Гусі», «Страказа» Я. Коласа, «Былі ў мяне мядзведзі» У. Караткевіча, «Арчыбал», «Алені», «Львы», «Пагоня» І. Пташнікава, «Бусел» А. Кажадуба і інш.).

Трэба адзначыць, што ў беларускай літаратуры другой паловы XX стагоддзя назіраецца тэндэнцыя для больш шырокага выкарыстання анімалістычных вобразаў. Найбольш часта яны сустракаюцца ў творах на экалагічную тэму, якая ў беларускай літаратуры абазначанага перыяду стаіць побач з чарнобыльскай (аповесць «Выратуй і памілуй нас, чорны бусел» В. Казько, апавяданне «Львы» І. Пташнікава, вершы «Вячэрняя малітва», «Белы конь» А. Пісьмянкова, верш «Тыя коні не пасвяцца ў травах ружовых», паэма «Чорная быль» С. Законнікава, вершы «Жураўлі», «Пчала», «Ластаўкі» М. Мятліцкага, паэма «Одзіум» Я. Сіпакова, апавяданне «Эвакуацыя» Н. Рыбік і інш.).

У другой палове XX стагоддзя чалавек набыў багацце ведаў пра прыроду, паглыбіўся ў яе таямніцы. Нягледзячы на экалагічную дасведчанасць, тым не менш грамадства па-ранейшаму працягвае негатыўна ўздзейнічаць на навакольнае асяроддзе, вынікам гэтай дзейнасці з'яўляецца збядненне жывёльнага і раслiннага свету. У наш час склалася думка, што жывёлы — меншыя браты чалавека і іх трэба ахоўваць. Вобразы прадстаўнікоў фауны ўсё часцей прысутнічаюць у творах беларускіх пісьменнікаў, выяўляюць гуманістычную скіраванасць сучаснага мастацкага мыслення. Тэма чалавек і прырода асэнсоўваецца ў беларускай літаратуры ў некалькіх напрамках: прырода як прадмет любові і шанавання, неабходнасць яе аховы (апавяданне «Былі ў мяне мядзведзі» У. Караткевіча, апавяданне «Алені» І. Пташнікава); адносіны чалавека да прыроды — паказчык людской добрасумленнасці (апавяданне «Арчыбал» І. Пташнікава); прырода як філасофія духоўнага быцця асобы (аповесць «Выратуй і памілуй нас, чорны бусел» В. Казько, апавяданне «Пагоня» І. Пташнікава).

Такім чынам, у беларускай літаратуры другой паловы XX стагоддзя назіраецца актуалізацыя і развіццё мастацкай анімалістыкі. Таму ўзнікла неабходнасць у дакладным высвятленні значэння гэтага літаратурнага паняцця.

Тэрміны «анімалізм», «анімалістыка» выкарыстоўваюць даследчыкі розных дысцыплін. Па-першае, этнографы, рэлігіяведы, гісторыкі разглядаюць анімалізм як сукупнасць абрадаў і вераванняў, якія звязаны з рэлігійным шанаваннем жывёл. Разнастайныя аспекты азначанай навуковай праблемы закраналі як замежныя, так і айчынныя даследчыкі: гісторыкі (А. Гурэвіч, Б. Рыбакоў), рэлігіяведы (Дж. Фрэзер, С. Токараў), археолагі (Ю. Шылаў), псіхолагі (З. Фрэйд, К. Юнг), этнографы і фалькларысты (А. Афанасьеў, М. Нікольскі, В. Проп, Я. Меляцінскі, А. Багдановіч, М. Нікіфароўскі, А. Сержпутоўскі, А. Ненадавец, І. Крук), лінгвісты (А. Патабня, С. Талстая, В. Маслава).

Па-другое, у мастацтвазнаўстве доўгі час выкарыстоўваюцца для характарыстыкі твораў скульптуры, графікі, жывапісу, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва з выявамі жывёл тэрміны «анімалізм»*, «анімалістыка», якія разглядаюцца як сінанімічныя тэрміну «анімалістычны жанр». Яго спецыфіка раскрываецца ў тым, што ў цэнтры ўвагі мастака знаходзяцца прадстаўнікі фауны — анімалістычныя вобразы. «Мастак-анімаліст надае асноўную ўвагу мастацка-вобразнай характарыстыцы жывёлы, яе звычкам, асяродку, у якім яна існуе» [9, с. 119]. У беларускім выяўленчым мастацтве XX ст. найбольш вядомыя мастакі анімалістычнага жанру — В. Ціхановіч, Г. Лойка, М. Бялянскі, Я. Кулік.

Па-трэцяе, услед за мастацтвазнаўцамі тэрміны «анімалізм», «анімалістыка» сталі выкарыстоўваць і пры характарыстыцы літаратурных твораў. Тэрміны з'яўляюцца новымі для літаратуразнаўства, яны толькі пачынаюць распрацоўвацца ў даследаваннях тэарэтыкаў літаратуры, таму ў літаратуразнаўчых крыніцах пытанне прадстаўлена шматаспектна і супярэчліва. Сярод асноўных тэрмінаў, якімі карыстаюцца даследчыкі, трэба вылучыць наступныя: «анімалізм», «анімалістыка», «анімалістычны жанр», «анімалістычная тэма», «анімалістычны псіхалагізм», «анімалістычны вобраз».

---

* Упершыню тэрмін "анімалізм" у дачыненні да мастацтва быў выкарыстаны ў адносінах да скульптуры ў 1831 годзе, калі тры маладыя французскія скульптары Антуан Луі Бары, Хрыстаф Фратэн і Аляксандр Жуйонэ зрабілі выставу фігурак жывёл ў Парыжскім Мастацкім Салоне.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Тлумачэнне тэрміна «анімалістычны жанр» у «Энцыклапедыі літаратуры і мастацтва Беларусі» носіць у чымсьці абмежаваны характар, сцвярджаецца, што гэта «жанр выяўленчага мастацтва і мастацкай літаратуры, які адлюстроўвае жывёльны свет» [10, с. 119]. Зусім неправамерна адносіць анімалістыку да жанру ў літаратуры, бо ў адрозненне ад выяўленчага мастацтва, дзе жанр вызначаецца на аснове прадмета выяўлення, а часам і характарам выяўлення, у аснове літаратурнага жанру — спосаб пабудовы вобраза. Іншымі словамі, калі ў выяўленчым мастацтве жанр вызначаюць на аснове аналізу зместу твора, у літаратуразнаўстве яго прадвызначае структура твора. Шэраг тэарэтыкаў літаратуры разглядаюць жанр як структурную адзінку. Так, В. Халізеў адзначае: «Разгляд жанраў немагчыма ўявіць без звяртання ўвагі да арганізацыі, структуры, формы літаратурных твораў» [13, с. 321]. Жанр — гэта змястоўна-структурная адзінка, анімалістыка ў літаратурным творы ўплывае не на структурную арганізацыю мастацкага тэксту, а на яго змястоўны бок.

Тэрмін «анімалістычная тэма» сустракаецца больш шырока ў расійскім літаратуразнаўстве. У кандыдацкай дысертацыі «Анімалістычная тэма ў сучаснай савецкай прозе і традыцыі рускай літаратуры» (1990) А. Казлова вылучае пласт мастацкіх твораў, дзе прысутнічае анімалістычная тэма. Аналізуючы рускую прозу XIX—XX стст., яна прапануе тыпалогію анімалістычных вобразаў, якая зроблена на аснове аналізу спосабу іх пабудовы. Даследчыца вылучае наступныя тыпы: жывёла як рэалія прыроды, вобраз-алегорыя, вобраз-сімвал і, нарэшце, псіхалагічны вобраз. Для яго характарыстыкі А. Казлова ўводзіць новы тэрмін — «анімалістычны псіхалагізм»*.

Тэрміны «анімалізм» і «анімалістыка» ў сучасным літаратуразнаўстве найбольш распаўсюджаныя, некаторыя даследчыкі разглядаюць іх як сінанімічныя. Вонкава даследчыкамі падкрэсліваецца сінанімічнасць дадзеных тэрмінаў, хоць пры больш пільным аналізе гэтых паняццяў можна адзначыць пэўныя адрозненні.

Вядомым расійскім вучоным у распрацоўцы пытання анімалізму ў літаратуры з'яўляецца М. Эпштэйн. У сваёй працы «Природа, мир, тайник вселенной...»: Система пейзажных образов в русской поэзии» (1990) ён адзначае: «Анімалізм як творча адказныя адносіны чалавека да жывёльнага свету — адзін з важнейшых сродкаў пашырэння сучаснага гуманізму, які выходзіць з наіўнай сваёй стадыі «абагаўлення» чалавека — да сталага супрацоўніцтва і ўзаемадзеяння з усімі формамі жыцця на зямлі» [12, с. 87].

Адна з дакладных трактовак тэрміна «анімалізм» прысутнічае ва ўкраінскім літаратуразнаўчым слоўніку: «мастацкае выяўленне жывёл, птушак, раслін і іншага праз прызму чалавечага светаадчування, наданне ім уласцівасцей чалавечага характару» [5, с. 42].

Такім чынам, пры характарыстыцы «анімалізму» гаворка ідзе пра асаблівасці светаўспрымання творцы, здольнасць аўтара пазнаваць і адлюстроўваць анімалістычныя вобразы. У гэтым праяўляецца спецыфіка мастацкага пачуцця, калі тое, што пазнаецца чалавекам, паступова пераходзіць у катэгорыю ўспрымаемага, а затым праз прызму свядомасці пісьменніка факусіруецца ў мастацкіх творах літаратуры. Пераканальнымі падаліся нам разважанні А. Макарэвіча пра тое, што беларускае пісьменства ідзе за правам асобы на індывідуальнае і непаўторнае светаўспрыманне і асэнсаванне праяў гэтага свету: «Пісьменнік, арыентуючыся на мастацкае адлюстраванне пэўнага кшталту грамадскай свядомасці праз паказ свядомасці адпаведных літаратурных герояў, становіцца на шлях пераўвасаблення ўласнай свядомасці. Гэта значыць, што стваральнік пэўнага мастацкага свету ўспрымае прататыпную рэчаіснасць ці мадэлюе яе ў адпаведнасці з патэнцыяльнымі магчымасцямі і жаданнямі сваёй мастацкай фантазіі, якая здольна трансфармаваць Я-свядомасць пісьменніка ў свядомасць мяркуемага літаратурнага героя. І Я-свядомасць пісьменніка, часова трансфармуючыся ў Я-свядомасць такога героя, успрымае мадэлюемую для будучага мастацкага твора рэчаіснасць «вачыма» свядомасці ў гэтага самага героя» [7, с. 22].

Што датычыцца тэрміна «анімалістыка», па аналогіі з мастацтвазнаўствам, у літаратуразнаўстве з'яўляецца найбольш універсальным. Да яго апелююць і даследчыкі, якія вядуць гаворку пра анімалістычную тэму (А. Казлова), і тыя, хто разглядае вобразы жывёл у мастацкай літаратуры ў межах анімалізму (М. Эпштэйн), а таксама навукоўцы, якія разглядаюць анімалістычныя вобразы ў межах даследавання пэўнага твора. Адсюль вынікае, што тэрмін «анімалістыка» мае большую сэнсавую аб'ёмнасць у параўнанні з тэрмінам «анімалізм», будзе ўключаць у сябе як сам «анімалізм», так і сістэму анімалістычных вобразаў і матываў.

---

* Гаворка ідзе пра тыя выпадкі, калі жывёла надзяляецца ў літаратурным творы здольнасцю думаць, разважаць.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Аналізуючы прапанаваныя вызначэнні мастацкай анімалістыкі, заўважым, што кожны раз даследчыкі скіроўваюцца да разгляду анімалістычных вобразаў. Разам з тым паняцце анімалістычнага вобраза характарызуецца шматзначнасцю. Тэрмін «мастацкі вобраз» у шырокім значэнні разумеюць як спосаб адлюстравання рэчаіснасці: «мастацкі вобраз — гэта адлюстраванне ў свядомасці чалавека жыццёвых з'яў» [4, с. 27]. «У шырокім разуменні вобразам называюць спецыфічную форму адлюстравання і пазнання рэчаіснасці ў мастацтве, у адрозненне ад тых форм адлюстравання, якімі карыстаюцца з аднаго боку, у навуцы, з другога — у штодзённа-практычнай сферы чалавечага жыцця» [2, с. 96]. Згодна з гэтым азначэннем, анімалістычны вобраз можа разглядацца як галоўны герой твора (вобраз сабакі Д'жукі ў апавяданні «Львы» І. Пташнікава), так і з'яўляцца элементам пейзажу (вобразы жывёл у аповесці «Чазенія» У. Караткевіча).

«У вузкім разуменні пад вобразам разглядаюць спецыяльную форму існавання мастацкага твора ў цэлым і ва ўсіх элементах, якія яго складаюць», — адзначаюць украінскія даследчыкі [2, с. 96]. Так, А. Галіч сярод іншых тыпаў вобразаў (вобраз чалавека, вобраз падзеі, вобраз пачуцця, настрою, вобраз прадмета) асобна вылучае анімалістычны. Дадзеная класіфікацыя заснавана на прынцыпе ўзаемадзеяння аб'екта як дыялектычнай еднасці аб'ектыўнага і суб'ектыўнага, і суб'екта як аб'ектыўнага адлюстравання жыцця ў суб'ектыўным яго асэнсаванні. Напрыклад, у аповесці «Дзік-бадзяга» Б. Сачанкі можна вылучыць асобна вобраз чалавека і вобраз дзіка.

Такім чынам, у сучасным літаратуразнаўстве існуюць розныя класіфікацыі вобразаў, дзе асобна вылучаюцца анімалістычныя. Фарміраванне сістэмы такіх вобразаў адбываецца пад уплывам асэнсавання іх як з канструктыўнага, так і са змястоўнага бакоў — дадзенае вызначэнне зроблена на аснове лагічных літаратуразнаўчых супастаўленняў, аналізу мінулага вопыту ў тэорыі літаратуры. Існуе і іншы падыход, які ўжо распрацаваны ў айчынным літаратуразнаўстве. У гэтым сэнсе трэба назваць працы беларускіх даследчыкаў А. Бельскага. В. Козіч, у якіх мастацкая анімалістыка разглядаецца ў межах даследавання вобразнай сістэмы твораў, на аснове цэласнага літаратурнага аналізу.

У беларускім літаратуразнаўстве пакуль што няма канцэптуальнай працы, прысвечанай праблеме мастацкай анімалістыкі, дзе быў бы сістэматызаваны ўвесь фактычны матэрыял, былі ўлічаны найноўшыя дасягненні ў галіне псіхалогіі, філасофіі і замежнага літаратуразнаўства. Канчаткова не вырашаны такія важныя аспекты праблемы, як дакладнае вытлумачэнне паняццяў «анімалістыка», «анімалізм»; у дачыненні да літаратурнай творчасці не раскрыты формы і прынцыпы функцыянавання анімалістычных вобразаў і матываў у сучаснай мастацкай свядомасці.

Мастацкая анімалістыка практычна не заўважалася ў савецкім літаратуразнаўстве, на ацэнцы мастацтва адбіліся ідэі дзяржаўнага абсалютызму 30-х гадоў, калі анімалістычныя вобразы аналізаваліся часцей у сістэме другасных вобразаў твора. «Адной з асноўных прычын гэтага, — зазначае А. Бельскі ў артыкуле «Мастацкая анімалістыка ў сучаснай беларускай літаратуры (да праблемы вывучэння і тыпалогіі)», — можна лічыць развіццё беларускай літаратуры пераважна ў сацыялагічным, афіцыйна аганжаваным аспекце. Сёння літаратуразнаўцы найперш улічваюць спосабы і формы ўласна мастацкага ўвасаблення рэчаіснасці» [1, с. 28]. Сучасныя літаратуразнаўцы пачалі пераасэнсоўваць творы беларускай літаратуры, імі было адзначана, што мастацкая анімалістыка ўздзейнічала на мастацтва слова, дапамагала перадольваць апісальнасць і вучыла пераглядаць больш чым стогадовыя стандарты і шукаць ва ўсім падтэкставасць, сімволіку, асацыятыўнасць, выходзіла на вызначэнне архетыпічнасці вобразаў, падкрэслівалася, што ў шэрагу твораў анімалістычныя вобразы выконваюць не дапаможную, а самастойную функцыю. Так, А. Макарэвіч у манаграфіі «Праблема жанравых мадыфікацый у беларускай прозе XIX — пачатку XX ст. » адзначае: «Апавяданні Я. Коласа з яго «Казак жыцця» ўяўляюць сабой адлюстраванне чалавека не на аснове іншасказання, эзопавай мовы, а на аснове паралеляў, у якіх і аб'екты прыроды, і чалавек з яго апасродкаванай прысутнасцю роўнавялікія» [6, с. 53]. Такая новая тэндэнцыя ў літаратуразнаўстве садзейнічае аналізу новай вобразнай сістэмы ў літаратуры — сістэмы анімалістчных вобразаў, якія разглядаюцца ў розных аспектах (рэалістычным, алегарычным, сімвалічным, псіхалагічным і г. д.). Такім чынам, гаворка можа ісці пра анімалізм як спосаб пазнання рэчаіснасці праз адлюстраванне свету жывёл. Сваё ж імкненне да стварэння гарманічнага свету суб'ектыўнай свядомасці анімалізм ставіць у прамую залежнасць ад архетыпаў, якія абвяшчаюцца інтуітыўным сродкам разумення рэчаіснасці, і міфалогіі, якая вытлумачвае суб'ектыўны свет.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

У даследаваннях айчынных літаратуразнаўцаў і крытыкаў анімалістыка як мастацкая сістэма прадстаўлена фрагментарна, у асноўным у межах разгляду асобных анімалістычных вобразаў пэўных твораў. Істотныя напрацоўкі ў гэтым кірунку зроблены ў кнігах і артыкулах беларускіх літаратуразнаўцаў М. Арочкі, А. Бельскага, Д. Бугаёва, П. Васючэнкі, У. Гніламёдава, П. Дзюбайлы, Л. Корань (Сіньковай), М. Мішчанчука, Т. Шамякінай, А. Яскевіча.

Беларуская літаратура другой паловы XX стагоддзя налічвае шмат твораў, у якіх галоўнымі героямі выступаюць прадстаўнікі фауны. Менавіта на гэтых творах больш пільную ўвагу засяроджваюць беларускія крытыкі. Сучасная мастацкая анімалістыка вылучаецца сваім сацыяльным зместам, актуальнай экалагічнай і гуманістычнай накіраванасцю. Творы беларускіх пісьменнікаў пра жывёл сведчаць пра якасна новыя ідэйна-творчыя пошукі. На першы план сёння выступае, аказваецца, адлюстраванне і апісанне не прыгажосці жывёльнага свету, а цяжкасцяў існавання ўсяго жывога ў экалагічнай рэтраспекцыі. Таму ўсё больш выразна заяўляе пра сябе ў літаратуразнаўстве другой паловы XX стагоддзя праблема мастацкай анімалістыкі.

Такім чынам, гаворачы пра адлюстраванне жывёльнага свету ў літаратуры, мэтазгодна выкарыстоўваць паняцце «мастацкая анімалістыка». Гэты тэрмін дапамагае выявіць ідэйна-тэматычны змест многіх твораў пра жывёл, а таксама, маючы сваю спецыфіку, указвае на адрозненне ў выкарыстанні тэрміна «анімалізм» даследчыкамі іншых сумежных дысцыплін. Можна зрабіць выснову, што мастацкая анімалістыка — цэлая своеасаблівая сістэма вобразаў і матываў фауны, якая грунтуецца на пэўных эстэтычных законах і прынцыпах функцыянавання. Анімалістыка ўключае ў сябе і падсістэму, якая разглядае анімалізм як спосаб мастацкага асэнсавання рэчаіснасці.

## Літаратура


1. Бельскі А. Свет ад травы да зор: Беларуская паэзія: сістэма вобразаў прыроды, паэтыка пейзажу. Мн., 1998.
2. Галич О., Назарець В., Васильєв Є. Теорія літературі: Підручник / За наук. ред. О. Галича. Київ, 2001.
3. Козіч В. І. Чалавек і прырода ў сучаснай беларускай прозе. Мн., 1998.
4. Лазарук М. А., Ленсу А. Я. Уводзіны ў літаратуразнаўства. Мн., 1982.
5. Литературознавчий словник-довідник / Р. Т. Гром'як, Ю. І.Ковалів та ін. К., 1997.
6. Макарэвіч А. М. Праблема жанравых мадыфікацый у беларускай прозе XIX — пачатку XX ст. Магілёў, 1999.
7. Макарэвіч А. М. Ад формы ўспрымання да формы адлюстравання (жанравыя мадыфікацыі беларускай прозы пачатку XX ст.) // Кулешовские чтения: Материалы научно-практической конференции: Тезисы докладов. Могилев, 2001.
8. Тимофеев Л. И. Основы теории литературы: Учеб. пособие для студентов пед. ин-тов. 4-е изд., испр. М., 1971.
9. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы. Мн., 1977.
10. Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: У 5 т. Мн., 1984. Т. 1.
11. Токарев С. А. Ранние формы религии. М., 1990.
12. Эпштейн М. Н. «Природа, мир, тайник вселенной»: Система пейзажных образов в русской поэзии. М., 1990.
13. Хализев В. Е. Теория литературы: Учеб. 2-е изд. М., 2000.


*L. G. BARANOUSKAYA*

**ON THE QUESTION OF THE DEFINITION OF THE TERM «ARTISTIC ANIMALISTICS»**

## Summary

The article deals with three aspects of the functioning of the terms «animalism», «animalistica». The author suggests an original explanation of the term «artistic animalistics» and presents it as a whole peculiar system of motives and images of fauna which is based on certain laws and principles of the functioning of these motives and images in function.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова